СЭЛІНДЖЭР (5alinger) Джэрам Дэйвід (н. 1.1.1919, Нью-Йорк), амерыканскі пісьменнік. Скончыў Пенсільванскую ваен. акадэмію (1936), вучыўся ў Нью-Йоркскім і Калумбійскім ун-тах. Друкуецца з 1940. Вядомасць прынёс раман «Над безданню ў жыце» (1951), у якім успрымальны да прыгажосці летуценны падлетак працістаіць практыцызму, канфармізму і спажывецтву дарослых. Аўтар шматлікіх навел, лепшыя з якіх увайшлі ў зб. «Дзевяць апавяданняў» (1953). Героі многіх яго твораў —дзеці, сумленнасць і погляды якіх спрыяюць выяўленню заганаў грамадства. Аўтар цыкла аповесцей пра сям’ю, у тл. «Вышэй кроквы, цесляры!» (1955), «Омар: першае знаёмства» (1959), «Фрэні 1 Зуі”(1961), «Гэпварт 16, 1924» (1965). На бел. мову яго аповесць «Гэпварт 16, 1924» пераклаў П.Маріновіч.

Тв: Рус. пер. — Над пропастью во ржи: Повести. Рассказы. М., 1991.

Літ:. Галинская И.Л. Философские и эстетические основы поэтики Дж Д Сэлинджера. М., 1975.

Т.Я.Камароўская.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ